Матузенка А.С., студ. гр. 312 ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Гуд Н.І.,
ст. выкладчык

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ НА СЕННЕНШЧЫНЕ. ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД НА СЕННЕНСКІ ЛАД

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожнаму пакаленню застаецца ў спадчыну тое, што стварылі талент і працалюбства бацькоў, што выяўляе нацыянальнае аблічча народа, якое кожнае пакаленне павінна шанаваць і памнажаць. У беларускага народа свая цудоўная спадчына. Стагоддзямі, узбагачалі і ўдасканальвалі, нягледзячы на цяжкія гістарычныя ўмовы, беларускую абраднасць, вытокі якой хаваюцца ў глыбокай старажытнасці. У ёй сцвярджалі свой эстэтычны ідэал, у яе ўкладвалі тонкі густ і высокае майстэрства.

Кожнае мястэчка Беларусі мае сваю асаблівую спадчыну, якая передавалася з пакалення ў пакаленне.

Вясельны абрад на Беларусі, як ніякі іншы, вылучаецца добрай ступенню захаванасці. Пра гэта сведчать не толькі вядомыя этнографы і фалькларысты. Рэдка якое з сучасных вяселляў абыходзіцца без спрадвечных традыцый абсыпання маладых жытам, абыходу святочнага поезда бацькамі з іконай, абрада дарэння, вясельнага каравая і ручніка, вясельных чыноў – сваты, дружкі. Усе гэтыя элементы паходзяць з глыбокай даўніны і з'яўляюцца чырвонай нітачкай, што звязвае нас, сучасных людзей, з продкамі.У жыхароў горада Сянно, што знаходзіцца ў Віцебскай вобласці, таксама свая асаблівая спадчына. Гэты горад багаты цудоўнай прыродай, блакітнымі азёрамі, якіх на Сенненшчыне шмат, а таксама сваёй непараўняльнай народнай культурай, характэрнай толькі для гэтага краю.

Супрацоўнікі Сенненскага РДК вырашылі зрабіць стылізацыю вясельнага абрада, якая будзе праходзіць ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Будынак з'яўляецца помнікам архітэктуры пач. ХХст. , якому сёлета

спаўняецца 100 год, а музей, размешчаны ў будынку былой земскай управы, у жніўні адзначыць сваё пятнаццацігоддзе.

Традыцыя праводзіць рэгістрацыю вяселля ў розных установах культуры (напрыклад, у Мінску, Віцебску) існуе ўжо пэўны час. На Сенненшчыне гэта справа толькі пачынаецца.

Па сцэнарыю " Вясельны абрад на Сенненскі лад", распрацаванаму для такога мерапрыемства, на парозе ўстановы культуры маладых сустрэлі супрацоўнікі музея і ўрачыста запрасілі на рэгістрацыю шлюбу.

Пасля ўрачыстай рэгістрацыі, дзе маладыя пакляліся быць вернымі адно аднаму на ўсё жыццё, дзейства перанеслася ў вясельны пакой музейнай выставы "Беларускае вяселле .Традыцыі і сучаснасць". У яго маладыя трапілі, прайшоўшы цераз рушнік, пакладзены каля ўваходу ў вясельны пакой. Усе абрадавыя дзеі суправаджаліся вясельнымі песнямі, якія выконваў народны ансамбль " Вясёлыя музыкі". У стылізаваным вясельным абрадзе былі выкарастаны такія абрадывая дзеі як пасад нявесты на хлебную дзяжу, павязванне рук маладых, абсыпанне зернем, а таксама беларускія гульні і вясельныя забавы. Зараз разгледзем асаблівасці і гісторыю кожнай з вясельных абрадавых дзей стылізаванага абрада " Вясельны абрад на Сенненскі лад".

Адно з асноўных абрадавых дзеянняў – пасад нявесты на хлебную дзяжу. Сімволіка дзяжы здавён цесна звязана з сімволікай хлеба, плоднасці, а таксама ў беларускай традыцыі асацыіруецца з жаночым чэравам. Як расце, падымаецца цеста ў дзяжы, так расце дзіця ў лоне маці. Дзяжа ў абрадавай практыцы заклікана спрыяць нараджэнню. На яе садзілася парадзіха ў час цяжкіх родаў, а на цеста, якое падыходзіла ў дзяжы, клалі хворае дзіця. Лічылася, што дзяжа, у якой расце каравай, здольная перадаць чалавеку такія вартасці, як доля, багацце.

Ў абрадавым дзеянні павязвання рук маладых ручніком таксама багатая гісторыя, якая мая свае асаблівасці. Сімволіка пояса (ручніка) – гэта заўсёды ахова, спрыянне, добразычлівы ўплыў, добраславенне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышэйшых сілаў. Повязь выконвае рытуальную ролю повязі двух пачаткаў – мужчынскага з жаночым, - двух сем’яў, двух родаў праз свае семантычныя знакавыя ўласцівасці, якія ўвасоблены ў арнаменце на гэтай палатніне. Належным чынам падрыхтаваныя для вяселля ручнікі, іх колькасць, прыгажосць малі, несумненна, прэстыжнае значэнне. Саматканыя, з узорыстай абмалёўкай, як пісаў у свой час беларускі гісторык, этнограф, фальклрарыст М.В. Доўнар-Запольскі, яны звычайна рыхтаваліся маткаю і дачкою загадзя, на ўсякі выпадак і прызначаліся для будучай радні як доказ здольнасці нявесты да хатняй работы.

Абсыпанне зернем жаніха і нявесты і іх шлях перед імі – традыцыя без якой не абходзіцца ні адно вяселле. Абсыпанне — вясельны абрад, звязаны з магіяй павелічэння сям'і і забеспячэння яе дабрабыту. На Сенненшчыне гэты абрад называўся абсяванне, якое існавала ў 2 відах: маладых абсыпалі іх родзічы (сястра, маці або хросная маці, цётка); маладая сама абсыпала двор і хату ўласную і маладога. Для абсыпання мяшалі жыта, авёс, гарох, хмель, пазней пачалі дабаўляць дробныя манеты, цукеркі. У некаторых мясцовасцях абрад абсыпання зліўся з абрадам аблівання вадой. У гэтым выпадку маці сыпала авёс у вядро з вадой, мачыла венік і апрысквала вясельны поезд, тройчы абягаючы яго.

Усе гэтыя абрадавыя дзеянні суправаджаліся гульнямі і вясельнамі забавамі, якія надавалі вяселлю свой непаўторны характар. Наогул, вяселле – гэта абрад яднання, злучэння маладых, пачатак новай сям’і і адначасова – працяг старажытнага чалавечага роду:

Ой, стэклося да дзве рэчанькі,
Ой, сышлося два посажэнькі...

Традыцыйнае вяселле дайшло да сённяшняга дня не як помнік сівой даўніны, а як дынамічна існуючая сістэма, якая займае адпаведнае месца ў сучасным жыцці і абрадавай практыцы ў якую можна ўносіць карэктывы, бо на сучасным этапе развіцця беларускага этнасу пераемнасць нацыянальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцый забяспечваецца ўзаемазвязанымі працэсамі абрадатворчасці і навукова-абгрунтаванай яго падтрымкай.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Вяселле : Абрад \ Уклад., уступ. арт. і камент. В 99 К. А. Цвіркі, Муз. дадатак З. Я. Мажэйка. Рэд. Тома В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-ое выд. – Мн. :Бел навука, 2004. – 683 с., нот. іл. - (Беларуская народная творчасць).

2. Фадзеева, В.Я. Беларускі ручнік / В.Я. Фадзеева. – Мн.: Навука і тэхніка,1994 – 215 с.

3. Ліцвінка В. Святы і абрады беларусаў. – Мн., 1997.

4. Колесо времени: традиции и современность/ Янка Крук,Оксана Котович.- 2-е изд.,испр. и доп.-Минск: Беларусь 2005.

5. Фальклор у запісках Яна Чачота і братоў Тышкевічаў/Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы;(рэд. кал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.)- 2-е выд.- Мінск: Беларуская навука 2005.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ